**Адкрытае акцыянернае таварыства «Палессе» ў снежні мінулага года адзначыла сваё 50-годдзе. Трыкатажнае адзенне з Пінску ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Сёння ў склад прадпрыемства ўваходзяць дзве фабрыкі з закончаным тэхналагічным цыклам: прадзільная і фабрыка верхняга трыкатажу. Асноўная прадукцыя ААТ — гэта пража розных складаў, трыкатажныя вырабы для мужчын, жанчын і дзяцей, дамашні тэкстыль, аксесуары — шапкі, рукавіцы, пальчаткі, пінеткі, — адным словам, асартымент даволі разнастайны.**



**Вядучы мастак-мадэльер Наталля КАНДЫБІНА дэманструе пражу розных колераў і саставаў, якую выкарыстоўваюць для вырабаў і рэалізоўваюць для ручнога вязання.**

# Прыгажосць, зр

## Тры інавацыйныя праекты рэаліза

Прадпрыемства стабільна развіваецца. Новыя ідэі мастакоў, дызайнераў, тэхнолагаў увасабляюцца ў новыя вырабы. Напрыклад, «Палессе» ўдзельнічала ў распрацоўцы аксесуараў (шапак, шалікаў, пальчатак) для беларускай зборнай на Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. Упершыню ў дадатак да экіпіроўкі беларускіх спартсменаў-алімпійцаў была прадстаўлена форма для балельшчыкаў, якую можна было набыць у крамах краіны.

Не першы год прадпрыемства ўдзельнічае ў праекце «Школа будучыні». Установам адукацыі прапануецца выбраць адзіную мадэль адзення дзелавога стылю. Школьную прадукцыю тут робяць з улікам пажаданняў бацькоў і вучняў. У якасці дапаўнення да школьнай формы прапануюцца жакеты і камізэлькі з паўшарсцяной і баваўняна-нітронавай пражы. Могуць зрабіць і адзенне для вучняў з нестандартнай камплекцыяй. Улічваюцца пажаданні па колеравай гаме дзелавога адзення, прадпрыемства вырабляе вышыўкі ў выглядзе эмблем устаноў адукацыі.

«Палессе» лічыць сваёй місіяй не толькі забяспечваць пакупніка камфортным, прыгожым, сучасным трыкатажным адзеннем, але і дарыць яму добры настрой, прыносіць у сям'ю ўтульнасць. Таму калекцыі абнаўляюцца, асартымент папаўняецца, развіваецца вытворчасць, — гаворыць **Таццяна АНТАШУК, начальнік аддзела маркетынгавых даследаванняў і планавання асартыменту.**

Апошнім часам на «Палессі» рэалізавалі тры інавацыйныя праекты: праект па цэльнавязаных (бясшоўных) трыкатажных вырабах, праект па ўкараненні фантазійнай пражы і па выпуску конусаў. **Галоўны інжынер фабрыкі верхняга трыкатажу Наталля ІВАНОВА** кажа, што бясшоўныя вырабы — гэта надзвычай цікавы від прадукцыі. Сукенка альбо світар без адзінага шва выглядаюць эфектна і могуць насіцца на два бакі. А мяккая пража ў сукупнасці з адсутнасцю швоў павышаюць камфорт нашэння адзення, выгадна падкрэсліваюць форму цела і дазваляюць адчуць свабоду руху.



Наталля Рыгораўна згадала, як спачатку купілі сем плоскавязальных машын нямецкай вытворчасці і зрабілі першую партыю ў якасці эксперыменту. Калекцыя разышлася хутка, спажыўцы сталі замаўляць яшчэ. Тады зноў купілі 17 машын, паставілі вытворчасць на стабільныя рэйкі. Такі спосаб вырабу, несумненна, мае свае перавагі. Сукенка, жакет альбо шапачка выходзяць гатовымі адразу з вязальнай машыны. Тут не прадугледжаная швейная апрацоўка, не трэ-

# ручнасць, стыль

## заваны нядаўна на ААТ «Палессе»

ба кроіць і шыць, а гатовая прадукцыя не мае швоў. Пасля вязання выраб праходзіць вільготна-цеплавую апрацоўку, правяраецца на якасць і перадаецца на склад.

Машыны маюць праграмнае кіраванне. Можна задаваць праграму на выраб сукенкі, а назаўтра перапраграмаваць на выпуск шапак альбо пальчатак. Такім чынам эканоміцца час і працоўныя рэсурсы, што добра ўплывае на кошт вырабу.



Другі інавацыйны праект датычыцца фантазійнай пражы. За гэтую новую справу пінскія трыкатажнікі ўзяліся з вялікім энтузіязмам. Для чалавека недасведчанага можна растлумачыць так: на прадзільнай машыне пастаўлены вязальны механізм. І пража атрымліваецца не з ніткі, а з валакна. Асаблівасць яшчэ і ў тым, што адбываецца секцыйнае фарбаванне. Такім чынам, участак палатна, напрыклад у 10 сантыметраў, можа чаргавацца з участкам іншай афарбоўкі ў тры альбо пяць сантыметраў. Поле для фантазіі і адпаведна варыяцый бясконцае. Гэты від пражы адрозніваецца таксама неабмежаванымі магчымасцямі спалучэнняў розных па колеры, таўшчыні і якасці пражы. Таму і называецца пража фантазійная, яе ніхто ніколі раней не выкарыстоўваў у Беларусі.

У 2018 годзе рэалізаваны інавацыйны праект па ўстаноўцы аўтаматычнай лініі выпуску кардонных конусаў. Раней конусы для намоткі пражы былі пластмасавыя, іх куплялі за мяжой. А цяпер гэтых конусаў хапае для сябе і яшчэ застаюцца на продаж. Ранейшыя пластыкавыя прыстасаванні паказалі сябе не вельмі зручнымі ў карыстанні, бо любая мініяцюрная трэшчынка здольная была пашкодзіць нітку. А цяпер з гэтых папяровых конусаў нітачка раскручваецца да канца ды ідзе ў справу. Апошні праект сэканоміў валютныя сродкі прадпрыемства і, што самае галоўнае, зрабіў значны ўнёсак у паляпшэнне экалогіі: пластмасу замянілі на кардон.

**Начальнік упраўлення па якасці акцыянернага таварыства Наталля ЛЕМЯШЭЎСКАЯ** расказала, што ААТ «Палессе» — нязменны лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, фестываляў моды, удзельнік розных выставак. Прадукцыі таксама прысуджаны тытул «Народная марка». Нядаўна сваю адзнаку атрымала і тэрмабялізна, зробленая з лёгкіх ніцей. Яна двухслойная, вільгацестойкая, незаменная для заняткаў фізкультурай і спортам, а таксама дзеля актыўнага адпачынку. Такім чынам, паводле




**З новай калекцыяй «Вясна — лета» знаёміць начальнік аддзела маркетынгу Таццяна АНТАШУК.**

вызначэння Наталлі Лемяшэўскай, высокая якасць, сучасныя мадэлі і высокатэхналагічная вытворчасць — складнікі поспеху пінскага прадпрыемства.

УНП 200286262.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**